**Гульня –квэст  “Троіцкае прадмесце”**

**Цікавыя факты**

- Траецкі касцёл будаваўся 4 разы. Упершыню храм з'явіўся тут у 1390 годзе. Пасля набегу крымскіх татараў яго аднавілі літаральна з попелу. Апошні праект касцёла – каменны – быў распрацаваны ў 1814 годзе.
- У 1790 пры касцёле было адкрыта брацтва Шчаслівай смерці.
- Менавіта тут з'явілася першая мінская паштовая скрыня (1870 год).
- Тут у 1891 годзе нарадзіўся Максім Багдановіч
- У адным з дамоў здымаў кватэру бацька Янкі Купалы.
- У 1962 годзе ў Мінск прыехаў Хрушчоў. Кіраўнік папрасіў паказаць яму гістарычны цэнтр сталіцы Беларусі, аднак характэрных месцаў для паказу высокапастаўленам госцю так і не знайшлося. Пасля гэтага выпадку было прынята рашэнне аднаўляцьТраецкае прадмесце.

**Месцазборуіагульнае фота каля помніка Язэпу Драздовічу**

Нарадзіўся 13.10.1888 года ў засценку Пунькі Глыбоцкага раёна ў беднай шляхецкай сям'і. У два гады застаўся без бацькі, яго і пяцёра братоў выхоўвала маці Юзэфа. Вучыўся ў Віленскай малявальнай школе (1906-1910) у прафесара жывапісу І. Трутнева. Служыў у арміі, працаваў настаўнікам малявання ў жаночай гімназіі ў г. Мінску і як ілюстратар актыўна упрацоўнічаў з часопісамі і газетамі.Язэп Драздовіч памёр 15 верасня 1954 года. **«Вечны вандроўнік»** — *помнік Язэпу Драздовічу ў Мінску на вул. Максіма Багдановіча*

***Правільнасць задання правяраецца фота або запісам інфармацыі***

**Заданне 1.**

1. **Знайсці <u>Музей М.Багдановіча</u>(ул. М. Багдановіча, 7А) і зрабіць сэлфі на фоне музея.**
2. **<u>Музей гісторыі бел.літаратуры</u> (М.Багдановіча, 13) і зрабіць сэлфі на фоне музея.**
3. **Зайсці ў музей і запісаць назву дзеючай выставы**

____________________________________

4. **Завітайце ў музей праса. Чаму ен так называецца?.**
5. **Знайсці <u>«Кітаеўская» сінагога (дом прыроды).</u>**

Гэты будынак быў пабудаваны хутчэй за ўсё ў 1874 годзе. У ім размяшчалася сінагога "Кітаеўская".Сваю назву сінагога атрымала ад імя яе ўладальніка Баруха кітайскага і якая лічылася галоўным домам малітваў для жыхароў Траецкага прадмесця. Пасля прыходу савецкай улады сінагогу зачынілі, у будынку прапісаліся розныя ўстановы. У гады Вялікай Айчыннай вайны гэты дом гарэў, але захаваў традыцыйны выгляд сінагагальнага будынка канца XIX-пачатку XX стагоддзя. У 1980-я гады помнік рэканструявалі і прыстасавалі пад выставачную залу музея прыроды і экалогіі Беларусі (у горадзе ён таксама вядомы як Дом прыроды). Тут рэгулярна

праходзяць асабліва папулярныя ў дзятвы выставы прадстаўнікоў рэдкай фаўны з усяго свету. Побач з Домам прыроды ўстаноўлена **скульптура «Дзяўчынка з савой».(сфатаграфацца)**

6. **Запісаць назвы вуліц, якія знаходзяцца на тэрыторыі Траецкага прадмесця________________________________**

7. **Знайсці ЗАГС і запісаць адрас__________________________________________________________**

8. **А зараз наведваем Гасцiную Уладзiслава Галубка.** Уладзісла́ў Галубо́к, сапр.: Уладзісла́ў Іо́сіфавіч Го́луб (Го́лубеў) (3 (15) мая 1882, станцыя Лясная, Навагрудскі павет, Мінская губерня, цяпер Баранавіцкі раён, Брэсцкай вобласці — 28 верасня 1937, беларускі драматург, празаік, рэжысёр, акцёр, мастак. Народны артыст Беларусі (1928). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1934).

**Сэлфi на фоне**

9. **Наведаць Востраў слез. Запiсаць прадметы архiтэктуры, размешчаныя на востраве**

**________________________________________________________________________________**

10. **Сустракаемся з кiраўнiком на гарбатым мосцiку. Робiм агульнае фота**

11. **Я хачу сказаць на заканчэнне квэста, што________________________________________**